**АЗЯРЭЦ** — былы пасёлак у Баронькаўскім сельскім Савеце, за 39 км на ПдЗ ад Касцюковіч, 20 км ад чыгуначнай станцыі Бялынкавічы на лініі Крычаў — Сураж, 205 км ад Магілёва. Транспартныя сувязі па прасёлачнай і далей па аўтадарозе Касцюковічы — Журбін.

Заснаваны ў 1920-х г. у выніку перасялення на былыя памешчыцкія землі сялян з суседніх вёсак. З сакавіка 1924 г. у БССР, з 17.07.1924 г. у Бялынкавіцкім, з 04.08.1927 г. у Касцюковіцкім раёнах. У 1926 г. – 18 двароў. У Вялікую Айчынную вайну 29.09.1943 г. вызвалены ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. Паводле перапісу 1959 г. — 59 жыхароў. У 1986 г. – 10 двароў 30 жыхароў, у складзе саўгаса «Зарэчны» (цэнтр — в. Вялікі Бор). Забудова рэдкая, аднабаковая, драўляная, сядзібнага тыпу.

У сувязі з радыяцыйным забруджаннем пасля чарнобыльскай катастрофы жыхары (10 сямей) пераселены ў чыстыя месцы.